Ірына ДАНІК

# ВЕЧНАЕ

## ЛЮБЫ ГРОДНА

Дуе вецер з Замкавай гары…
Уздымаю вочы, а ўгары
Воблакі, як лёгкія шары.
Неба ў Нёмне мочыць каўняры.
Я пайду праз ціхія двары…
Кветак там – ахапкамі бяры.
Ні пра што ты мне не гавары-
Любы Гродна новы і стары.
Адгукнецца позірк да зары
І паплыў, мінаючы віры.
Ззяе ў промнях сонечнай пары-
Будзе заўтра новае тварыць.
Тут былі ўсялякія цары…
Дзе яны цяпер – уладары?
Хоць усе палі пераары-
Не вярнуцца тыя ваяры.
А жывуць шафёры, муляры.
Хімікі, студэнты, цесляры.
Нашых дзён вясёлыя вятры,
Шчырыя сяброўкі і сябры.
Замкі ўсе, Каложа, дзве сястры.
Песні, што ў прыгаршчы бяры
І нашчадкам словы падары,
А што дрэнна будзе - то сатры…

*2.07.14.*

## ГРОДЗЕНСКАЕ ЛЕТА

На Гродзенскіх вуліцах лета…
Праменнні да бруку злятаюць,
А ў сэрцы юначым паэта
Прыгожыя словы ўзнікаюць.
Ідзе ён па парку… па плошчы…
Глядзіць на заморскія кветкі,
А сонца надзею палошча
І хмар высыхаюць сурвэткі.
Калісьці вось так па каменнях
Хадзілі Карпюк і Ажэшка.
Ішло не адно пакаленне…
У кожнага - новая сцежка.

І дом, дзе маленькі Максімка
Глядзеў на далёкія зоры,
Сягоння, як новая сімка-
Заложана столькі гісторый.
І хай выціскае сучаснасць
Мінулага дух непаўторны,
Наперадзе ў горада – яснасць
І тысячы новых гісторый…

*2.07.14.*

## ГРОДНА

Давай паходзім па Гародні…
Прыгожы горад кожны дзень.
Ты для любога станеш родным,
Для многіх нацый і людзей.
Твае сады, праспекты, паркі
І плошчы ў квецені сцягоў…
І Нёман, што плыве праз аркі
Усіх узведзеных мастоў.
Стары і Новы – твае Замкі
Заўжды прыцягваюць народ
І даўніны далёкай знакі
Мужнеюць тут ад года ў год.
Калі іду па звонкім бруку,
Я бачу твой сучасны лад
Нібы з вякоў працягнеш руку
І цвёрды камень – быццам брат.
А колькі тут было паэтаў…
Мацнеў іх почырк кожны раз!
І паважае свет за гэта:
Што ні радок – вышэйшы клас.
Усіх яднаеш да асновы,
Каб непаўторным стаў вiток
І застануцца людзям словы,
Як Багдановіча “Вянок”…

## РАНАК ЖЫЦЦЯ

Над вадою клубіўся туман…
Белы-белы, нібы малако.
У прыроды гарачы раман –
Цалавалася неба з ракой.
Урачыста світанак палаў
Над задумлівай поймай ракі
І прамень першабытна кранаў
Востры край залатой асакі.
Заківаў галавою чарот,

Вербы з воч пакрывала знялі
І віроў зацалованы рот
Засмяяўся, як хвалі плылі.
Ах, як хочацца жвавай вадзе
Заставацца такой, як раней…
Ранак плыў у сягодняшні дзень
Жаніхом на зялёным чаўне…

## СЯРЭДЗІНА ЛЕТА

Зязюля змоўкла да Пятра…
Гавораць – будзе холадна
Але ўсё кружыцца вятрак
І пазірае молада.
Мо і было калі раней,
Што восенню - мяцеліца…
Але не верыцца ўсё мне.
Што будзе так – не верыцца.
Бо тут – сярэдзіна цяпла,
Амаль макушка ліпеня.
Зязюля проста ўцякла,
А нам спякота выпала.
І млява марыцца траве
Пра ўсе нягоды гэтыя,
Адно танцулькі ў галаве
Пад песні недапетыя…

*14. 07.14 .*

## ЭСКІЗ

…Бусел памыўся ў цёплай вадзе-
Смешна адбіўся пахілены дзень.
Потым расправіў над сцежкай крыло…
Жоўценькі гравій і лета было.
Высахнуць крылы – і зноў паляціць…
Гэты край мілы яму не забыць…
ЦЁПЛЫЯ НОЧЫ, ГАРАЧЫЯ ДНІ.
Цёплыя ночы, гарачыя дні…
Сохне трава пад нагамі вятрыска.
Нават кусаюць людзей авадні,
Калі яны набліжаюцца блізка.
А на палях пачалося жніво-
Падае колас прад ім на калені…
Жоўтай саломы духмяны сувой
Сцелецца доўга, нібыта праменні.
І неспакой…неспакой…неспакой
Моцна агорне душу маладую,
Бо над Зальвянкай – імклівай ракой

Месяц павесіў струну залатую.
Грае той ліпень на звонкай струне
І паплыла яго песня на хвалях.
Ціхае воблака ў цёплым руне
Мякка схавалася з ёю ў далях.
Зноў над зямлёю ўспыхне зара
І павучок заплятае ёй косы.
Дадзена нам тут Радзіму ствараць-
Проста і чыста, нібыта пракосы…

## У ВЯНОК ЦЁТЦЫ

Хацелася, як лепш…
Каб назаўжды з Радзімай…
Але прыходзіў верш.
І бачым – не адзіны.
Хацелася найперш
Аддаць сябе народу,
А лёс… Яго хоць рэж-
На смерць ёй выдаў згоду.
Хацелася пісаць
На радасць Беларусі
І сцяг яе падняць
У радасці і скрусе.
…Расколецца скала,
А мора вечна будзе…
Як добра, што была
І песняй стала ў людзе…

## МАРА ЦЁТКІ

Верыла, што так і будзе…
Марыла, каб стала так…
А гады былі – як суддзі
І жыццё - нібы кулак.
Толькі слова засталося,
Беларуская зямля
І ад зернетка – калоссе,
Што пакінула ралля.
Мова родная ліеццца,
Як імклівая рака…
Наша сувязь не парвецца,
Наша крэўнасць – у вяках…

*2014*

## ЯНА ЖЫЛА

Ад тых часоў – стагоддзе праляцела,

Калі жыла паэтка на зямлі…
А як яна на свеце жыць хацела!
Як марыла, каб сёння мы жылі.
І як радкі паперу цалавалі,
Калі яна пісала новы верш…
Але вайна… І клічнікамі сталі
Яе сляды паміж ваенных меж.
“-Няўжо навек пакіну тое неба,
Дзе так прывольна плакаў салавей?
І позірк ніў, і цёплы водыр хлеба,
І васількі на ласкавай траве?
За ўсё, за ўсё заплачана здароўем…”
…Глядзеў у вочы твой апошні шлях.
А новы дзень запальваўся зарою,
Нібы маёй Радзімы вольны сцяг!

## ЗЭЛЬВЕНСКІЯ МАТЫВЫ

Звінеў калісьці Ганненскі кірмаш
І з розных месц у Зэльву прыязджалі:
З Масквы, Варшавы і з Парыжа аж!
О, іх заўсёды радасна страчалі.
Цяпер не тое… Высахла рака…
І баржы тут даўно не праплываюць.
Але Сапегі чуецца рука,
Як толькі грушы ў садзе паспяваюць.
Аднойчы тут ён дрэвы пасадзіў
І людзі іх назвалі “Сапяжанка”…
Салодкія, духмяныя… Глядзі:
Яны цяпер яшчэ красуюць ярка.
Той час забыўся ў памяці людзей,
А смак яго застаўся ў нашых душах.
У цёмнай гушчы радасных падзей-
Усё хавае нашых лёсаў пушча…

*2014*

## ЗЭЛЬВА

Зэльва стала сягоння прыгожай-
Гэта слаўны сапегаўскі кут.
Ён заўжды іншаземцаў трывожыць
І застацца прымушвае тут.
У кнігарні, у ціхай кавярні,
У той плошчы, дзе вольна душы.
У разбуранай каменнай стайні.
У будынках, што спяць ля шашы.
Як прайдуся адна каля цэрквы-
Нібы бачу стагоддзяў сляды,

Што вялі да яе толькі сэрцы…
Не разбурылі гэта гады.
Эх, якія былі тут кірмашы!..
Дух іх недзе паціху паўзе.
І ад гэтага радасці нашы
Даражэйшымі сталі ў вазе.
Як жа добра, што зноў ажывае
Свята тое, забытае сном
І Зальвянка, як сведка жывая,
Зноў вітаецца сонечным днём…

*Ліпень 2014 г.*

# МАЕ…

Прабіраюся праз гушчар
Маіх думак, адкрыццяў, сумненняў.
І надзея смяецца ў твар,
Ды і веры жыве не меней.
Ну, адкуль вырастаюць яны?..
Іх так многа, як сонца ў небе.
І прыгожыя – як сыны,
Ці як кветкі на роднай глебе.
Прачынаюся – і плывуць…
Абвіваюць мяне рукамі…
Разам з кроўю маёй жывуць,
Урастаюць у плоць вякамі.
Не адчэпяцца – не прасі.
Хоць бажыся – твае навекі.
Разам з целам сваім насі
Мае думкі, нібыта лекі…

# ЗВАНЫ

У касцёле званілі званы-
Рэха бегла ад іх далёка…
Быццам клікалі лета яны,
Ці буслоў адляцеўшы клёкат.
Лес вяршынамі загудзеў…
Застагналі макушкі сосен…
Быццам сэрцы чужых людзей,
Што сваю пахавалі восень.
Ах, як хораша звон ляцеў!..
Чулі ўсе, хто хацеў убачыць
Салаўя серабрысты спеў,
Перапёлкі зялёны мячык.
І як толькі пагас прамень,
На якім ён ляцеў у неба-
Нібы вывернуў плуг крэмень,

Што даўно пахавала глеба…

## ЦАРКВА

Да сівога Нёмана
Рэчачка цякла…
А на горцы стомлена
Плакала царква.
Слёзы яе чыстыя
Капалі ў расу
І сама Прачыстая
Запляла касу.
Слёзы яе выцерла,
Завязала бант.
Залатымі ніцямі
Падтрымала рад.
І малітву цёплую
Богу панясла…
Звон – як сэрца цёхкае…
Цэрква ажыла.
Дзверы не зачыняцца-
Людзі йдуць і йдуць…
Над маёй Айчынаю
Словы іх плывуць…

## ВЕЧНАЕ

Няхай ляцяць стагоддзі і гады –
Гісторыя далёкая не схлусіць,
А Гродна застанецца назаўжды
Культурнаю сталіцай Беларусі.
Тут кожны камень ведае цану
Жыцця і шчасця, гора і нядолі,
Бо перажыў ён не адну вайну,
Але заўсёды прагна марыў волі.
Сягоння час над горадам ляціць,
Пад фабрык гул і вытрымку заводаў,
А нашым марам радасна цвісці
У сонечным вяночку карагодаў.
Ад тых часоў няскораны алень
У новы век нястрымана нясецца
І сустракае з намі новы дзень,
Які жыве пад рытмы яго сэрца.
Пакуль ён з намі – не баіцца час
Ісці адважна ў сённяшнія будні
І за сабой вядзе спакойна нас,
Бо мы адно – як вечнае са студні.

*2.07.14*



**Ірына Мікалаеўна ДАНІК**
**(1949-2018)**